# Статья в «Настауніцкай газеце» – «Знакомство с профессией» (вып. от 08.05.2014г.)

«Знаёмства з прафесіяй» – статья, опубликованная в «Настауніцкай газеце» от 8 мая 2014 года.

Настаўніцкая газета
8 мая 2014 года

**З надыходам вясны мы рыхтуемся да сустрэчы з новымі абітурыентамі, якія хутка стануць паўнапраўнымі членамі калектыву навучэнцаў Магілёўскага прафесійнага электратэхнічнага каледжа. Хто прыйдзе ў наш каледж, з якой мэтай — для нас гэта важна. Каб не было шкадаванняў і расчараванняў у выбранай прафесіі, мы праводзім вялікую падрыхтоўчую работу.**

# Знаёмства з прафесіяй

Магілёўскі прафесійны электратэхнічны каледж з'яўляецца эксперыментальнай пляцоўкай рэспубліканскага ўзроўню па фарміраванні прафесійнай арыентацыі навучэнцаў старшых класаў сярэдніх школ. Сутнасць эксперымента ў тым, каб распрацаваць і апрабіраваць сістэму інфармацыйна-педагагічнай падтрымкі фарміравання прафесійных намераў навучэнцаў старшых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Ідэя эксперымента абумоўлена рэальнай неабходнасцю забяспечыць рынак працы рабочымі кадрамі пэўных прафесій і патрэбным узроўнем кваліфікацыі. Кіруе праектам эксперыментальнай дзейнасці Эдуард Мечыслававіч Каліцкі, першы прарэктар УА "РІПА", кандыдат педагагічных навук. Наш каледж працуе ў творчым тандэме з Магілёўскім абласным кадэцкім вучылішчам, сярэднімі школамі № 34, № 21 Магілёва.

Мы разам рэалізоўваем задачы па прафесійным самавызначэнні навучэнцаў, развіцці ўяўлення аб прэстыжы, перавагах прафесій электратэхнічнага профілю. Электратэхнічны каледж аснашчаны сучасным абсталяваннем, якое дазваляе даць поўнае ўяўленне школьнікам аб прафесіі "Электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання". Акрамя таго, педагагічныя работнікі каледжа знаёмяць школьнікаў з прафесіяй, выкарыстоўваючы практыка-арыентаваны падыход, развіваючы практычныя навыкі, атрыманыя ў школе. Рэалізоўваецца прынцып сувязі прафесійнай арыентацыі з жыццём, работай, практыкай. Усё гэта актывізуе цікавасць школьнікаў да прафесіі, дае ўяўленне аб неабходных прафесійных і асобасных якасцях электраманцёра.

Вынікі анкетавання паказалі прыярытэтныя асаблівасці прафесій энергетычнага профілю з пункту гледжання школьнікаў: высокая заработная плата; атрыманне не толькі прафесійных, але і практычных навыкаў, якія патрэбны ў побыце, у жыцці; магчымасць далейшага прафесійнага, творчага росту. Галоўнае, што работа, якая праводзіцца, дае высокую выніковасць: штогадовае выкананне плана набору каледжа больш чым 100%, з наступным 100-працэнтным працаўладкаваннем выпускнікоў. Варта адзначыць, што вельмі мала навучэнцаў каледжа, расчараваных у выбранай прафесіі. Значыць, эксперымент, які праводзіцца, дае станоўчыя вынікі. Мы спадзяёмся, што і ў гэтым годзе да нас прыйдуць абітурыенты, зацікаўленыя ў выбранай прафесіі.

**Галіна ЮЖАКОВА,**
**метадыст Магілёўскага прафесійнага электратэхнічнага каледжа.**